# Пасольская інструкцыя ад шляхты Полацкага ваяводства на сойм 1640 г.

*Галубовіч В.У. /Наваполацк/*

У айчыннай гістарыяграфіі вывучэнне праблем гісторыі парламентарызму ў Вялікім Княстве Літоўскім з’яўляецца адносна новым накірункам даследаванняў. Толькі пры канцы ХХст. і на пачатку ХХІ ст. на Беларусі пачалі з’яўляцца асобныя артыкулы[1], і нават манаграфічныя працы[2]. Побач з прычынамі, якія былі абумоўлены наяўнасцю табуіраваных тэм у беларускай савецкай гістарыяграфіі, значнай перашкодай на шляху вывучэння розных аспектаў гісторыі парламентарызму стала адсутнасць у айчынных архівах падставовых комплексаў крыніц, неабходных для вырашэння гэтай праблемы. У першую чаргу, гэта датычыцца соймавых дыярыюшаў і асабліва суправаджаючай кожны сойм дакументацыі, дзе адно з галоўных месцаў займаюць пасольскія інструкцыі ад ваяводстваў і паветаў Рэчы Паспалітай і, у тым ліку, ВКЛ. На сённяшні дзень у накірунку вывучэння праблем парламентарызму ў ВКЛ кіруючыя пазіцыі займаюць польскія гісторыкі, што абумоўлена не толькі актуальнасцю праблемы для польскай гістарыяграфіі і грамадства ў цэлым, але і канцэнтрацыяй у польскіх архівах значнай часткі “соймавых” дакументаў. Дзеля прыкладу варта будзе толькі прыгадаць апошнія працы вядомых польскіх гісторыкаў А. Закшэўскага і А. Рахубы, прысвечаныя розным аспектам гісторыі парламентарызму на землях ВКЛ у XVI-XVIII стст.[3]

Значную цікавасць для айчыннай гістарыяграфіі ўяўляе вывучэнне пасольскіх інструкцый ад беларускіх ваяводстваў і паветаў ВКЛ. Гэта неабходна для асэнсавання грамадска-палітычных настрояў павятовай шляхты і спецыфікі адлюстраван-

---

[1] Лойка П.А. Сфера палітычных інтарэсаў шляхты беларускіх земель у апошняй трэці XVI - першай трэці XVII ст. // Весці БДУ (Серыя №3).- 2000.- № 1.- С. 3-7.; Галенчанка Г. Развіццё шляхецкай дэмакратыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI-XVIII ст.// Герольд-Litherland.- 2001.- № 3-4.- Год I.- С. 85-102.

[2] Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI –першай трэці XVII ст.- Мінск.: БДУ, 2002.- 99 с.

[3] Zakrzewski A.B. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI-XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki / Wydział prawa i administracji Uniw. Warszawskiego.- Warszawa: LIBER, 2000.- 257 s.; Rachuba A. Parlamentarzym Wielkiego Księstwa Litewskiego z XVI-XVIII w. (у друку ў Соймавым выдавецтве ў Варшаве).

ня ў гэтых дакументах яе мясцовых інтарэсаў. На вялікі жаль, нават у польскіх архівах інструкцыі паслам ад паветаў ВКЛ захаваліся толькі часткова. Да таго ж, інструкцыі, як вядома, складаліся незаўсёды[4]. Дадзены матэрыял пабудаваны на аналізе пасольскай інструкцыі ад шляхты Полацкага ваяводства на сойм 1640 г., увогуле адзінай інструкцыі ад полацкай шляхты, якая захавалася за час праўлення Уладзіслава IV Вазы, калі не ўлічваць полацкай інструкцыі, падрыхтаванай на элекцыйны сойм 1632 г.[5] Захоўваецца дадзены дакумент у другім раздзеле Архіва Радзівілаў у Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве [6].

Неабходна адразу адзначыць, што ў польскай гістарыяграфіі дадзеная пасольская інструкцыя вядома, але як прадмет асобнага вывучэння яна ніколі не выступала. Пасольскую інструкцыю ад полацкай шляхты на сойм 1640 г. неаднаразова выкарыстоўваў у сваіх працах вядомы польскі гісторык Г.Віснэр[7]. Асобныя артыкулы полацкай інструкцыі зацікавілі Г.Віснэра выключна ў больш шырокім кантэксце для пацвярджэння ці ілюстрацыі тых ці іншых палажэнняў.

Аналізуемая інструкцыя з'яўляецца не арыгінальным дакументам, а "відымусам", г. зн., копіяй, што, дарэчы, адрознівае яе ад інструкцый 1640 г. з іншых паветаў ВКЛ, якія захаваліся ў Архіве Радзівілаў. Як вынікае з самога дакумента, паслядоўнасць яго ўзнікнення наступная: першапачатковы тэкст інструкцыі, складзены на перадсоймавым сойміку ў Полацку 27.III.1640 г. быў, згодна з правілам, скапіраваны 29.III.1640 г. у полацкую гродскую кнігу, а праз некалькі дзён – 3.IV.1640 г. - полацкі падваявода Ян Лісоўскі завізаваў уласнай пячаткай факт выдачы "*стороне потребуючой*" копіі інструкцыі ўжо з гродскай кнігі. Такім чынам, полацкая інструкцыя захавалася у выглядзе копіі, якая, да таго ж, зроблена не з арыгінала, што можа выклікаць слушныя сумнівы ў яе поўнай дакладнасці.

[4] Zakrzewski A.B. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI-XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki / Wydział prawa i administracji Uniw. Warszawskiego.- Warszawa: LIBER, 2000.- S. 117.

[5] Wisner H. Naprawa państwa w uchwałach sejmików Wielkiego Księstwa Litewskiego w pierwszej połowie XVII w.// Studia polsko-białoruskie.- 1988.- Białystok.- S. 49.

[6] Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie, Archiwum Radziwiłłów, dział II, sygnatura № 1197.

[7] Wisner H. Naprawa państwa w uchwałach sejmików Wielkiego Księstwa Litewskiego w pierwszej połowie XVII w.// Studia polsko-białoruskie.- 1988.- Białystok.- S. 33-50.; Wisner H. Sejmiki litewskie w czasach Zygmunta III i Władysława IV. Konwokacja Wileńska oraz sejmiki przedsejmowe i relacyjne // Miscellanea historico-archiwistica. T. III. Radziwiłłowie XVI-XVIII wieku w kręgu polityki i kultury.- Warszawa-Łódź.- 1989.- S. 51-66.; Wisner H. Sejmiki litewskie a kwestia wyznaniowa 1611-1648 // Odrodzenie i reformacja w Polsce.- T.XXIII.- 1978.- S. 123-150.

Тэкст інструкцыі напісаны на польскай мове, а выпіс - па-старабеларуску. Для каго быў зроблены “відымус”, сказаць цяжка, але зыходзячы з канчатковага месца знаходжання, г. зн., Архіва Радзівілаў, можна дапусціць, што інструкцыя спатрэбілася Крыштапу Радзівілу, вялікаму гетману ВКЛ. У якасці апекуна і кіраўніка пратэстанцкага лагеру краіны, ён быў зацікаўлены ў інфармацыі пра настрой шляхты, тым больш перад соймам, на якім праблемы іншаверцаў павінны былі стаць і сталі сярод найбольш дыскусійных[8].

Згодна з існуючай у “паслялюблінскім” ВКЛ традыцыяй ад кожнага сойміка, якія збіраліся ў ваяводствах і паветах, на сойм шляхта выпраўляла двух паслоў[9]. Але не заўсёды вядома, хто непасрэдна прадстаўляў інтарэсы шляхты, паколькі прозвішчы спецыяльна не рэгістраваліся. Каштоўнасць пасольскіх інструкцый як крыніц палягае ў тым, што ў іх, як правіла, ва ўводнай частцы адзначаліся прозвішчы абраных паслоў. Полацкая інструкцыя 1640 г. у гэтым сэнсе не выключэнне. Пасламі ад павета на сойм, згодна інструкцыі, прызначаліся Ян Казімір Пац, вялікі пісар ВКЛ і пакаёвы дваранін Яго Каралеўскай Мосці, а таксама Пётр Беганскі, полацкі падстолі. Абраныя ад полацкай шляхты асобы не належылі да шэраговай шляхты, мелі значны досвед палітычнага жыцця і з’яўляліся парламентарыямі сярэдняга ўзроўню. Абраны паслом ад Полацкага павета Я. К. Пац быў асобай у значнай ступені неардынарнай. Палітычнае жыццё распачаў у пачатку 30-х гадоў XVII ст. у Валынскім ваяводстве, у 1633 г. быў дэпутатам Літоўскага Трыбуналу, але вяршыняй яго кар’ернага росту стала намінацыя на ўрад вялікага пісара ВКЛ пры заступніцтве каралевы Цэцыліі Рэнаты[10], выдазеная каралём толькі ў траўні 1639 г. [11]. Паслом на соймы Я.К. Паца таксама абіралі ад іншых паветаў у 1635 г. і 1646 г.[12]. Аўтар біяграмы Я.К.Паца ў “Польскім біяграфічным слоўніку” Г. Люлевіч, адзначыў,што ў палітычным жыцці Я.К. Пац не адыгрываў значнай ролі, чаму, магчыма, перашкаджаў яго канфліктны характар і бясконцыя маёмасныя судовыя працэсы, больш таго, ён, па меншай меры, шэсць разоў аб’яўляўся

[8] Czapliński W. Sprawy wyznaniowe na sejmie roku 1640 // Acta Universitatis Wratislaviensis.- ą 543.- Historia XXXVI.- Wrocław.- 1981.- S. 107-117.
[9] Wisner H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita.- Warszawa: NERITON.- 2001.- S. 27.
[10] Lulewicz H. Pac Jan Kazimiez // Polski Słownik Biograficzny.Tom.XXIV/4. Zeszyt 103.- Wrocław.- 1979.- S. 700.
[11] Urzędnicy centralni i dostojnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV-XVIII wieku. Spisy.Opracowali Henryk Lulewicz, Andrzey Rachuba.- Kórnik, 1994.- S. 130.
[12] Dzięgielewski J. Izba poselska w systemie władzy Rzeczypospolitej w czasach Władysława IV.- Warszawa.- S. 175.

банітам, што, аднак, не перашкодзіла яго прызначэнню пасланнікам Рэчы Паспалітай у 1647-1648 гг. да маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча[13]. Пётр Казімір Беганскі перад тым, як пачаў рухацца па павятовай іерархіі ўрадаў у Полацкім ваяводстве, меў значныя заслугі ўжо пры двары Жыгімонта III Вазы, а потым – Уладзіслава IV Вазы і з'яўляўся пакаёвым дваранінам караля, што адзначаецца ў намінацыйным прывілеі на ўрад полацкага чэсьніка, які ён атрымаў 15.III.1636 г. па авансе на полацкае земскае пісарства Яна Падбіпенты[14]. Цікава, што наступны ўрад, падстольства полацкае па смерці Абрахама Зеновіча, П. Беганскі атрымаў 3.I.1640 г.[15], г. зн., толькі за некалькі месяцаў да абрання яго 27.III.1640 г. паслом на сойм. Пры гэтым у намінацыі асабліва падкрэслівалася, што П. Беганскі вылучаўся "*праз уласныя цноты і аздобы, якія не перастае адаваць заўсёдна знаходзячыся пры нашым* (каралеўскім – **В.Г.**) *боку*"[16]. Абранне свежанамінаванага падстолія і адначасова дасведчанага каралеўскага слугі паслом гаворыць аб пракаралеўскіх настроях часткі полацкай шляхты. Дарэчы, далейшы лёс П. Беганскага дастаткова трагічны: у 1654 г. пастаўлены на чале шляхты пад Глыбокім, ён трапіў у маскоўскі палон, дзе і памёр[17].

Пасольская інструкцыя, як від дакумента з'ўлялася спісам патрабаванняў і прапаноў, якія абраныя на сойміку паслы павінны былі па магчымасці выканаць. Зразумела, што большая частка пунктаў, якія фіксаваліся ў інструкцыі, заставаліся нерэалізаванымі, але веданне іх дае магчымасць выявіць сферы інтарэсаў павятовых абывацеляў.

У цэлым, пункты полацкай інструкцыі 1640 г. успрымаць досыць цяжка з-за таго, што яны, за пэўным выключэннем, не аб'яднаныя па тэматыцы ў блокі праблем, а раскіданы па розных старонках дакумента, што сведчыць аб пэўнай хаатычнасці фіксацыі асобных прапаноў пры складанні дакумента. Тым не менш, структура дадзенага дакумента ў цэлым тыповая для інструкцый[18].

[13] Lulewicz H. Pac Jan Kazimiez // PSB.Tom.XXIV/4. Zeszyt 103.- Wrocław.- 1979.- S. 700.

[14] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, КМФ-18, воп.1, спр.111, аа. 548 адв.–549.

[15] НГАБ, КМФ-18, воп.1, спр.113, аа. 477 – 477 адв.

[16] Тамсама.

[17] Kojałowicz W. W. Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego tak zwany Compendium czyli o klejnotach albo herbach których familie stanu rycerskiego w prowincyach Wielkiego Xięstwa Litewskiego zażywają. Kraków.- 1897.- S. 238.

[18] Zakrzewski A.B. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI-XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki / Wydział prawa i administracji Uniw. Warszawskiego.- Warszawa: LIBER, 2000.- S. 122.

Калі дапусціць, што ў першых пунктах інструкцыі змяшчаліся найбольш актуальныя праблемы, то адной з самых над-зённых для полацкай шляхты напярэдадні сойма 1640 г. была праблема вайны. У першым пункце полацкай інструкцыі адзначалася, што каралеўскі пасланец на перадсоймавым сойміку ў Полацку ад імя манарха паведаміў аб нарастаючай небяспецы вайны з Турцыяй і асабліва з Маскоўскай дзяржавай. Тут жа трэба адзначыць, што каралеўскі пасланец прадстаўляў на сойміку традыцыйнае перадсоймавае пасланне - каралеўскую інструкцыю з аднолькавым зместам - адрасаваную асобна кожнаму павету. Копія тэкста каралеўскай інструкцыі на соймікі, якія павінны былі адбыцца 27.III.1640 г., захавалася ў знакамітых Тэках Нарушэвіча, і на яе старонках сапраўды ў змрочных фарбах малюецца тагачасная міжнародная сітуацыя, склаўшаяся вакол Рэчы Паспалітай[19]. У адказ на гэта полацкім паслам інструкцыя рэкамендавала параіцца з іншымі пасламі і пры неабходнасці пагадзіцца з падаткамі, улічыўшы, што Полацкае ваяводства ў першай маскоўскай экспедыцыі выдаткавала на вайну “*калі не менш, то роўна з іншымі ваяводствамі*”[20]. Неабходна адзначыць, што кароль і яго атачэнне імкнуліся выкарыстаць пагрозу вайны з Турцыяй у 1640 г. для таго, каб атрымаць згоду паслоў на ўвядзенне новых падаткаў, але самі паслы вайну лічылі справай далёкай ад рэальнасці[21]. З гэтага пункту гледжання, каралеўская ўлада атрымала з боку полацкага сойміка падтрымку. Аднак, як відаць з “ухвалы”, апублікаванай у “Volumina legum”, полацкія паслы на сойме 1640 г. падаткі ўсё ж не прынялі, а канчатковае рашэнне аб выдатках на вайну пакінулі для абмеркавання ў павеце[22].

Непасрэдна з першым пунктам трэба разглядаць наступны, які па ліку быў трэцім. У чарговы раз полацкія абывацелі не абмінулі звярнуць увагу на стан полацкага замка, які называўся “*брамай ад усёй Русі і Вялікага Княства Літоўскага*”. Зыходзячы з таго, што вестка пра небяспеку ад Маскоўскай дзяржавы паходзіла ад самога караля, полацкая шляхта прапанавала адбудаваць і забяспечыць полацкі замак згодна з канстытуцыяй 1607 г.

[19] Biblioteka Narodowa w Warszawie.- Dział Mikrofilmów.- № 6700.- S. 253-256.
[20] AGAD, AR, dz. II, sg № 1197.- S. 1.
[21] Filipczak-Kocur A. Skarb lietewski za pierwszych dwu Wazów 1587-1648.- Wroclaw: W-wo Uniw. Wrocławskiego.- 1994.- S. 96.
[22] Volumina Legum / Przedruk zbioru praw staraniem XX. Pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego.- Ň.V.- Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki.- 1859.- S. 467.

Наступная праблема, якая закранаялася ў інструкцыі адносілася да сферы міжканфесійных стасункаў і была, як адзначалася вышэй, адной з самых дыскусійных. У інструкцыі шляхта патрабавала разабрацца з крыўдамі, учыненымі каталікам і каталіцкай царкве ў Вільні, паколькі каралеўская камісія (працавала з 19.IX.1639 г. па 15.II.1640 г.[23]) не выканала сваіх мэтаў. Ад полацкіх паслоў асабліва патрабавалася садзейнічаць высвятленню новых эксцэсаў і нападаў у дзень Св. Мацея на дамініканскі касцёл у Вільні. У дакуменце выразна прасочваецца аднабаковае пракаталіцкае бачанне супрацьстаяння каталікоў і пратэстантаў. Цікава, што ў антыкаталіцкай і адпаведна супрацьлеглай полацкай інструкцыі на той жа сойм, дадзенай паслам ад Вількамірскага павета, сярод розных крыўд, учыненых каталікамі пратэстантам, таксама згадваецца разбурэнне збора ў Полацку[24], якое мела месца ў 1638 г.[25]. Не апошнюю ролю ў антыпратэстанскім тоне інструкцыі адыграла і тое, што ў пасяджэнні перадсоймавага сойміка прымаў удзел полацкі ўніяцкі архіепіскап Антоні Селява, які пакінуў свой подпіс пад тэкстам інструкцыі. Прысутнасць на сойміку полацкага архіепіскапа, з пункту гледжання парламенцкай практыкі ў ВКЛ, не выклікае здзіўлення, а ў адносінах да полацкага сойміка гэта можна лічыць і пэўнай традыцыяй[26].

Чацверты пункт інструкцыі патрабаваў ад паслоў, каб яны дамагаліся "слушнай узнагароды" за заслугі ў абароне Айчыны для Януша Кішкі, полацкага ваяводы і польнага гетмана ВКЛ.

Асобна неабходна разглядаць шэраг пунктаў, якія датычыліся адносінаў Полацкага ваяводства і сумежных правінцый і дзяржаў. Шэраг значных прэтэнзій выказвала полацкая шляхта да Курляндыі. Так, полацкім паслам даручалася скасаванне ўстаноўленага Мікалаем Карлам, вэндэнскім кашталянам, прызборскага мыта на Дзвіне, якое значна абцяжарвала шляхту і купцоў. Далей полацкая інструкцыя патрабавала стварыць камісію згодна з канстытуцыямі 1607 г., 1631 г. і 1638 г. з прадстаўнікоў Полацкага ваяводства і Курляндскага княства ў Друі ці Браславе для разгляду прэтэнзій шляхты ВКЛ да курляндскіх абываеляў.

Надзвычай надзённай праблемай для полацкіх абываце-ляў з'яўлялася найхутчэйшае вызначэнне межаў з Маскоўскім

[23] Wisner H. Władyslaw IV Waza.- Wrocław-Warszawa-Krakow.- 1995.- S. 140-141.
[24] AGAD, AR, dz. II, sg № 1196.- S. 3.
[25] Wisner H. Władyslaw IV Waza.- Wrocław-Warszawa-Krakow.- 1995.- S. 139.
[26] Wisner H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita.- Warszawa: NERITON.- 2001.- S. 34.

бокам у раёне Невеля, Себежа, Краснага і Усвят. Паколькі прызначаная камісія не дасягнула паразумення, і Полацкае ваяводства знаходзілася ў стане перманентнай небяспекі, то мясцовая шляхта ставіла перад пасламі задачу паспрыяць стварэнню на сойме новай камісіі па размежаванню.

Вылучаецца ў інструкцыі і такая спецыфічная праблема, як шляхецкія прэрэгатывы. Полацкія шляхціцы заяўлялі, што ўрад віленскага гараднічага, войта і будаўнічага павінны надавацца толькі “польскаму” аседламу шляхціцу, а не іншаземцу. Паслам жа даручалася дамагчыся адхілення ад пасады тагачаснага ўрадніка і пільнаваць, каб болей у ВКЛ іншаземцы ўрадаў не атрымлівалі. Яшчэ больш пільна паслы павінны былі сачыць, каб не парушалася канстытуцыя “Аб іншаземных тытулах”, прынятая на сойме 1638 г., згодна з якой уся шляхта лічылася роўнай, а новыя тытулы лічыліся несапраўднымі[27]. У гэтым пункце паслам нават дазвалялася не прыступаць да кансультацый. Ад імя полацкай шляхты зыходзіла патрабаванне карыстацца земскім, а не магдэбургскім правам, пры разглядзе спраў адносна “*збеглых і іншыя розныя крыўды*” паміж шляхтай і мяшчанамі.

Як і ў кожнай іншай інструкцыі таго часу, у полацкай прысутнічаюць заўвагі аб парушэннях права, злаўжываннях і шляхах ўдасканалення дзяржаўнага ладу. Так, у інструкцыі адзначаецца: насуперак праву ўраднікі атрымліваюць соймавыя лісты ў абыход канцылярыі; некаторыя паслы з’яўляюцца непасрэдна перад канклюзіяй і касуюць ужо абмеркаваныя канстытуцыі; праца паслоў абцяжарваецца прыватнымі справамі, што стала прычынай частых зрываў соймаў. Мелі прэтэнзіі полацкія абываці і да падскарбіяў. Паслы павінны былі пастарацца, каб кіраўнікі скарбу прыязджалі для справаздач на пачатак пасяджэнняў сойма, а не на канклюзію, і абгрунтоўвалі выдаткі аўтэнтычнымі дакументамі.

Не абмінулі полацкія шляхціцы ў інструкцыі факты ціску на пасольскую ізбу з боку сената. Прычынай гэтага пункту стала слынная справа з сойма 1639 г., пад час якога ў спрэчцы каронны падканцлер Ежы Асалінскі абразіў мазавецкага пасла Бараноўскага, што ўрэшце прывяло да зрыву сойма[28].

На дзіва актуальнай для полацкай шляхты, як вынікае з інструкцыі, з’яўлялась жыдоўская праблема. Адпаведна ў да-

[27] Volumina Legum / Przedruk zbioru praw staraniem XX. Pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego.- Ň.˛V.- Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki.- 1859.- S. 441-442.
[28] Czapliński W. Władyslaw IV i jego czasy.- Warszawa.- 1972.- S. 272.

куменце вылучаецца асобны блок пунктаў. У першую чаргу, аўтараў інструкцыі непакоіла тое, што “*contra dignitatem stanu szlacheckiego*” жыды становяцца сакратарамі, супраць чаго павінна быць прынята адпаведная канстытуцыя. А далей у інструкцыі пастулявалася забарона жыдам прымаць на службу хрысціян, спасылаючыся на канстытуцыю Петрыкаўскага сойму 1565г., забарона ім на трыманне мытных кантор, корчмаў і інш. згодна з канстытуцыяй сойму 1567 г. Патрабавалася таксама, каб жыды не выходзілі з юрысдыкцыі ваяводаў, старастаў і сваіх старэйшын, паколькі так лягчэй для шляхціца пазбегнуць прамаруджванняў спраў з жыдамі з-за іх карумпіраванасці, як гэта бывае ў асэсарскім судзе. Прасілі полацкія абывацелі дазволу для шляхціцаў на арэнду пагалоўнага жыдоўскага падатку, калі ён будзе ўхвалены на сойме, а таксама, каб хрысціянін, а не жыд, збіраў іншыя падаткі.

Апошняя частка пасольскіх інструкцый традыцыйна адводзілася для такіх патрабаванняў і просьбаў ад імя павета, якія мелі прыватны характар ці датычыліся ўласна мясцовых патрэб. Так, напрыклад, ад імя ўсяго павета полацкія паслы павінны былі прасіць караля адзначыць заслугі паноў Віскоўскіх і вярнуць іх дабро ў Полацкім ваяводстве ў Невельшчыне ці кампенсаваць іх страту. Асабліва адзначаюцца ваенныя заслугі ў розных ваенных экспедыцыях Аляксандра Віскоўскага (дарэчы, ён так сама падпісаў інструкцыю) і Геранiма Віскоўскага, які “*Rzpptey służąc sławą niesmiertelną s postrzału żywota dokonał y za trzy czwierci wysłużoną, zasług swoich nie otrzymał*”. Павінны былі прасіць паслы і за Юзэфа Рабея Гнайніцкага, каб яму кароль даў узнагароду як “*emirito militi*” і інш.

Дастаткова вялікі спіс індывідуальных просьб скончваецца пажаданнем, каб раздача пляцаў у полацкім замку для абывацеляў была гарантавана канстытуцыяй, а Ніжні замак забяспечваўся за кошт полацкіх мяшчан. Апошні ж пункт інструкцыі патрабаваў скасаваць няслушны маставы збор на Віленскім гасцінцы ў маёмасці Паўла Казла, ашмянскага падстолія.

Трэба заўважыць, што ў параўнанні з пасольскімі інструкцыямі ад іншых паветаў ВКЛ на сойм 1640 г., полацкая інструкцыя вылучаецца менавіта тым, што колькасць індывідуальных просьбаў у ёй адносна вялікая. Растлумачыць гэта можна як аддаленасцю павета, такі і жаданнем атрымаць падзяку за спрыянне каралеўскай інструкцыі.

Пад пасольскай інструкцыяй быў зафіксаваны 21 подпіс. Добра ўсведамляючы, што пад інструкцыяй “падпісваўся хто хацеў, а часам хто мог” і што “лічба подпісаў на акце не ёсць

верагодным сведчаннем прысутнасці”[29] , усё ж прыгадаем найбольш уплывовых асоб, якія падпісалі дакумент. Сярод вышэй узгаданых на чале з А. Селявай, былі ўраднікі іншых паветаў: Мікалай Кунцэвіч, падкаморы пінскі, Марцыян Гедройц, падсудак віленскі. Далёка непоўным складам падтрымалі пункты інструкцыі ўласна полацкія ўраднікі. Яе падпісалі Міхал Тышкевіч, падсудак земскі полацкі, Ян Падбіпента, пісар земскі полацкі, Тэафіл Храпавіцкі, войскі полацкі, і Ян Лісоўскі, полацкі падваявода. Акрамя гэтага, на сойміку прысутнічаў Станіслаў Жук, каралеўскі сакратар.

Ацэньваючы полацкую пасольскую інструкцыю на сойм 1640 г., трэба адзначыць яе скіраванасць на кампраміс з прапановамі каралеўскай улады, але менавіта для Полацкага ваяводства гэта было ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. У інструкцыі займаецца выразная антыпратэстанцкая пазыцыя ў канфлікце паміж каталікамі і пратэстантамі. Прапановы полацкіх паслоў аб паляпшэнні функцыянавання дзяржаўнай машыны ў цэлым не вылучаюцца арыгінальнасцю і сведчаць аб усведамленні недахопаў дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Значная частка пунктаў адносіцца да сферы лакальных інтарэсаў Полацкага ваяводства ў цэлым і канкрэтных асоб. Полацкая інструкцыя па духу сваіх прэтэнзій і заяў была паклікана гарантаваць правы і прывілеі шляхецкага стану. У якасці заключэння адзначым, што рэалізацыя пунктаў полацкай інструкцыі ў выглядзе канстытуцый на сойме 1640 г. не мела месца.

[29] Wisner H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita.- Warszawa: NERITON.- 2001.- S. 47.